# ЦІ ЗАКОНЧЫЦЦА ПАРЛАМЕНЦКІ МАРАФОН?

Гэта пытанне, бясспрэчна, хвалюе вельмі многіх выбаршчыкаў. Даць станоўчы адказ надта рызыкоўна. А пакуль што пазнаёмім сваіх чытачоў з тымі кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, якія зарэгістраваны акруговай выбарчай камісіяй па Гомельскай-Цэнтральнай выбарчай акрузе №86 г.Гомеля, у якую ўваходзяць і два выбарчыя ўчасткі, якія размяшчаюцца ў вучэбных карпусах №1 і №2 нашага універсітэта.

29 лістапада выбаршчыкам акругі належыць аддаць свой голас за аднаго з кандыдатаў у дэпутаты парламента:

**ДАВІДОВІЧ** Уладзімір Уладзіміравіч, 1949 года нараджэння, інжынер-тэхнолаг, эканаміст, старшыня Цэнтральнага райвыканкома г.Гомеля, беспартыйны, жыве па вул. Працоўная;

**ІВАШЧАНКА** Іна Паўлаўна, 1943 года нараджэння, інжынер-цеплатэхнік, вучоны сакратар Гомельскага аддзялення Беларускай інжынернай акадэміі, член Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці, жыве па вул. Першамайская;

**ІПАЦЬЕЎ** Віктар Аляксандравіч, 1942 года нараджэння, інжынер лясной гаспадаркі, дырэктар Інстытута лесу Акадэміі навук Беларусі, член партыі камуністаў Беларусі, жыве па вул. Валатаўская;

**КУЗЬМІЧ** Юрый Рыгоравіч, 1962 года нараджэння, інжынер-будаўнік, намеснік начальніка Адміністрацыі зон адчужэння і адсялення па Гомельскай вобласці, член Аграрнай партыі, жыве па вул. Мазурава;

**ПЕТРАЧЭНКА** Уладзімір Дзмітрыевіч, 1953 года нараджэння, інжынер-канструктар завода станочных вузлоў, член Беларускай партыі "Зялёны свет", жыве па вул.Малайчука;

**СТАРЧАНКА** Уладзімір Мікалаевіч, 1958 года нараджэння, выкладчык фізічнага выхавання, дацэнт кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны, член партыі Беларускага Народнага Фронту, жыве па вул. Свірыдава.

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



| № 17(899) | АЎТОРАК, 21 лістапада 1995 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная |
|---|---|---|---|---|

## АДКРЫТЫ ФРАНКА-БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ

Гэтай падзеі папярэднічала вялікая мэтанакіраваная падрыхтоўчая работа ў рамках дзяржаўных праграм па вышэйшай школе. Пачалася яна з восені 1993 года. Менавіта тады паміж Гомельскім дзяржаўным універсітэтам імя Ф.Скарыны і прафесіянізаваным інстытутам "Інжынерыя менеджмента" Овернькага універсітэта горада-пабраціма Клермон-Феран былі ўстаноўлены трывалыя двухбаковыя сувязі. Пасля гэтага французскія дэлегацыі неаднаразова наведвалі горад над Сожам, а прадстаўнікі ГДУ, у сваю чаргу, выязджалі ў Францыю. Кожная сустрэча насіла канструктыўны характар, прыносіла новыя карысныя вынікі.

У прыватнасці, у мінулым годзе французскія калегі сумесна з кіраўніцтвам Гомельскага дзяржуніверсітэта правялі значную работу па канкрэтызацыі праектаў міжнароднай праграмы "Тэмпус", пасля чаго быў падпісаны адпаведны кантракт. Для асваення гэтай праграмы ГДУ выдзелілі значныя сродкі ў доларах.

Першым практычным крокам па ажыццяўленню выпрацаванага праекта з'явілася стажыроўка студэнтаў эканамічнага факультэта ГДУ ў інстытуце "Інжынерыя менеджмента". Адна група прайшла яе ў папярэднім навучальным годзе, а цяпер на стажыроўцы ў Францыі знаходзіцца другая група нашых лепшых студэнтаў, якія атрымалі гэта права на аснове конкурснага адбору. Французскія ж студэнты стажыруюцца ў Гомелі.

І вось прыйшоў дзень, які ўвойдзе ў гісторыю абодвух універсітэтаў. 15 лістапада ў выніку плён-

(Заканчэнне на 2 стар.)





На ўрачыстым адкрыцці Франка-беларускага інстытута кіравання выступае прафесар Морыс Шэневуа.

### З УЗНАГАРОДАЙ!

*За шматгадовую плённую навуковую і вучэбную работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці загадчыца кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю дэкан эканамічнага факультэта дацэнт **КАРПЕЙ** Тамара Васільеўна ўзнагароджана Ганаровай граматай універсітэта.*

# АДКРЫТЫ ФРАНКА-БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1 стар.)**

нага супрацоўніцтва Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны і універсітэта г.Клермон-Феран пры садзейнічанні Пасольства Францыі і Міністэрства адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь на базе ГДУ адкрыты Франка-беларускі інстытут кіравання, фінансаванне якога ажыццяўляе французскі бок.

На ўрачыстасць прыбылі пасол Францыі ў Рэспубліцы Беларусь Клод Жоліф, саветнік па культуры французскага пасольства Франсуа Лоран, дырэктар інстытута "Інжынерыя менеджмента" універсітэта Клермон-Феран прафесар Морыс Шэневуа, першы намеснік міністра адукацыі і навукі Беларусі, старшыня Камітэта па навуцы і тэхналогіях прафесар В.П.Стаўроў, старшыня Гомельскага аблвыканкома П.У.Шыпук, старшыня гарвыканкома С.В.Шапавалаў, прафесар Лонданскага універсітэта Д.Дзінглі, рэктары гомельскіх ВНУ і рэктар Полацкага дзяржуніверсітэта, многія іншыя госці.

На пачатку адбылася сустрэча ў рэктараце. Рэктар акадэмік Беларускай акадэміі адукацыі, член-карэспандэнт АН Беларусі Л.А.Шамяткоў расказаў пра Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны, асноўныя напрамкі яго дзейнасці і міжнародныя сувязі. Затым быў дадзены вычарпальны адказ на пытанне, якое паступіла з французскага боку.

Пасля гэтага для шматлікіх гасцей прадставілася магчымасць азнаёміцца ў чытальнай зале універсітэцкай бібліятэкі з выставай разнастайнай навуковай прадукцыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў ГДУ.

Затым святочная ўрачыстасць працягвалася ў вучэбным корпусе №5 фізічнага факультэта, дзе выдзелены аўдыторыі і для Франка-беларускага інстытута кіравання. З вялікім задавальненнем Л.А.Шамяткоў прадставіў прысутным самых шаноўных гасцей. А затым ён і дырэктар інстытута "Інжынерыя менеджмента" Морыс Шэневуа падрабязна гаварылі, як зараджалася і развівалася супрацоўніцтва паміж Гомельскім універсітэтам і універсітэтам г.Клермон-Феран, якія мэты і задачы пастаўлены перад Франка-беларускім інстытутам кіравання, на якой аснове будзе весціся набор студэнтаў, на якім узроўні пачне забяспечвацца навучальны працэс.

Зазначым, што вучоба ў інстытуце разлічана на пяць гадоў, два з іх -- падрыхтоўчыя. На заключным этапе прадстаўляецца магчымасць на працягу навучальнага года стажыравацца гамяльчанам ва універсітэце г.Клермон-Феран. Выпускнікі міжнароднай ВНУ будуць атрымоўваць два дыпломы: ГДУ і універсітэта горада-пабраціма з Францыі.

Аб важнасці адкрыцця новага інстытута гаварылі і выказвалі найлепшыя пажаданні для яго плённай дзейнасці старшыня аблвыканкома П.У.Шыпук, старшыня гарвыканкома С.В. Шапавалаў, пасол Францыі ў нашай рэспубліцы Клод Жоліф, першы намеснік міністра адукацыі В.П. Стаўроў, былы прарэктар Гомельскага пядінстытута імя В.П.Чкалава доктар гістарычных навук, прафесар, Герой Савецкага Саюза А.А.Філімонаў.

... Заняткі ў Франка-беларускім інстытуце кіравання для 28 студэнтаў спецыяльнасці "Правазнаўства" і эканамічнага факультэта пачаліся з лекцый французскіх выкладчыкаў.

У добры шлях, новая міжнародная ВНУ!

**Б.ВАЛОДЗІН.**
**Фота У.Чысціка.**

Наша прафесарская

# НА НІВЕ АКТЫЎНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ



Нічым асаблівым не вызначаецца ён у шумным чалавечым акружэнні. Аднак калі Леанід Міхайлавіч Сапегін з"яўляецца на кафедры, то ўсе звяртаюцца да яго. І тады ўсталёўваецца такая абстаноўка, што проста адчуваеш глыбокую павагу і зацікаўленасць да яго. Такія адносіны назіраюцца ўсюды: і ў асабістых гутарках, і пры яго выступленнях з лекцыямі як перад студэнтамі, так і перад насельніцтвам горада і вёскі. Гэта сапраўдны лектар, таленавіты педагог, выдатны прапагандыст, працалюбівы, чулы і сціплы таварыш.

Працоўная біяграфія Л.М.Сапегіна пачалася з дзяцінства, на якое выпалі цяжкія гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд. Леанід Міхайлавіч выйшаў з рабочай сям"і, сярэднюю школу закончыў у Касцюкоўцы. Вышэйшую адукацыю набыў у Гомельскім педінстытуце імя В.П.Чкалава. Пэўны час працаваў дырэктарам школы ў былым Капаткевіцкім раёне. Вялікая прага да навукі зноў прывяла яго ў родны інстытут, дзе паспяхова закончыў аспірантуру і ў 1968 годзе стаў кандыдатам біялагічных навук, а ў 1986-м -- доктарам навук.

На працягу пяці гадоў ён узначальваў біялагічны факультэт, а з сакавіка 1986 г. па цяперашні час загадвае кафедрай батанікі і фізіялогіі раслін.

На лекцыях і ў іншых відах заняткаў Л.М.Сапегін выкарыстоўвае навейшыя дасягненні навукі і перадавога вопыту. Ён паспяхова кіруе навукова-даследчай работай студэнтаў. Многія з іх на конкурсах рознага ўзроўню за свае даследаванні атрымалі высокія адзнакі.

Леанід Міхайлавіч вядзе плённую навукова-даследчую работу. Атрыманыя вынікі ўкараняе ў практыку сельскай гаспадаркі з вялікім эканамічным эфектам. Яму належыць звыш 150 навуковых прац, сярод якіх тры манаграфіі, 2 курсы лекцый і падрыхтаваны дапаможнік па батаніцы /сістэматыцы вышэйшых раслін/, які знаходзіцца ў выдавецтве.

Л.М.Сапегіну ўласціва высокая прынцыповасць пры выкананні грамадскіх даручэнняў. Ён з"яўляецца членам Савета Беларускага рэспубліканскага батанічнага таварыства, членам секцыі біялагічных і медыцынскіх навук НТС Мінадукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь, членам навуковага Савета АН Рэспублікі Беларусь па праблеме "Біялагічныя асновы рацыянальнага выкарыстання, ператварэння і аховы расліннага свету; членам секцыі травяных /лугавых і стэпавых/ біягеацэнозаў, навуковага Савета АН Рэспублікі Беларусь па праблемах біяцэналогіі і аховы прыроды. Яго нястомная праца адзначана граматай і Ганаровай граматай Мінвуза былога СССР, граматамі ГДУ.

Пастаянна працаваць з поўнай аддачай сіл, як мага больш рабіць для людзей і разам з тым заўсёды заставацца маладым душой і сэрцам -- адметныя асаблівасці Леаніда Міхайлавіча Сапегіна.

**В.ВЕРАМЕЙЧЫК,**
**дацэнт кафедры батанікі і фізіялогіі раслін.**



*Об итогах конкурса "А ну-ка, первокурсник!"*



Это как пора года. Его ждёшь, к нему готовишься, надеешься на лучшие перемены, ожидая массу информации. Это новые встречи, улыбки, слёзы радости и огорчений. Это жизнь, наша с вами неповторимая студенческая жизнь. Это "А ну-ка, первокурсник!" 1995 года.

Подготовка конкурса каждого года одинакова и различна одновременно. Идея выявить таланты и возможности творчества в самих себе у нового поколения студентов -- это то, чего добиваемся мы, работники культурного центра университета. Задор, энтузиазм, желание творить и возможности -- это лицо первокурсников-конкурсантов. Есть ещё одна сторона у всего этого: неугасаемое рвение творить, выдумывать, созидать и побеждать, проявлять наработанный опыт сценарно-режиссёрско-постановочной работы и, немаловажно, порой неосознанно, воспитательно-педагогические моменты, полученные за годы учёбы в университете.

Уже в процессе подготовки я поймала себя на мысли, что группы факультетов я именую для себя, как театральные труппы: ребята Саши Якушенко, студенты Кузьменковой, Дорощенские дети, Ванины первокурсники и т.д. и т.п. Ну, чем это не театр Любимова на Таганке или группа актёров Олега Ефремова во МХАТе?

# ИГРА В СКАЗКУ. СЕРЬЁЗНАЯ И ТАЛАНТЛИВАЯ

Так какой же был "первокурсник-95"?!

По-моему, он удался по-настоящему. И серьезным отношение было к нему не только из-за победного рвения. Думаю, что все мы играли в эту игру серьезно и уже по-взрослому. Порой, студентам первого курса не хватало внутреннего состояния творческого подхода к тем программам, которые предлагались и готовились старшекурсниками.

Не могу не остановиться на работе историко-юридического факультета. Сценарий, всё-таки для любителя, но уже с заявкой на профессионализм, студента 5-го курса Ивана Присяжного был почти безукоризненным. Идея, построение, логическая нить задуманного и музыкальный подбор говорили о том, что это не случайная удача, а продуманная творческая работа прежде всего Ивана, а также всех членов оргкомитета. В него вошли опять же не случайные люди: Жанна Биран, Сергей Михлин, Ольга Асланова, Алексей Ященко и многие другие ребята. Моё мнение по данной программе, которую я бы определила как отвечающую всем требованиям интеллектуальной молодёжи дня сегодняшнего с заглядыванием в день завтрашний, высокое. Она не безупречна, как всё талантливое. Может быть, оргкомитету нужно было бы взвесить исполнительские силы в этой программе. Ведь именно первокурсникам необходимо было донести до зрителя тот калейдоскоп сказочных событий, который происходил на сцене. Только качественное исполнение всех моментов раскрывало бы всю идею. Замысел программы подразумевал и высокий профессиональный исполнительский уровень. Третье место, которое определило жюри конкурса, было спорным именно из-за неполного соответствия уровней сценария и исполнения. При этом лично мне понравилась работа Дмитрия Самченко, Светланы Бобко, Константина Мышкина, Владимира Скуратова и, конечно, великолепная "Дэнс-группа". Некоторые из них стали лауреатами этого года.

Почти первыми были в этом году студенты экономического факультета. "Стабильно вторые" -- так я бы назвала их многолетние итоги творчества. Но по нынешнему году я бы добавила эпитеты великолепные, по-хорошему задиристые, задорные, танцующие и поющие, неплохо, что довольные собой и верящие в свои силы. Чего не хватило ребятам в этом году, чтобы ухватить пальму первенства? Может быть, не до конца выстроенной программы, при таком обилии интересных номеров. Идея, будучи незамысловатой, была немного спонтанной, насыщенной многочисленностью исполнителей, которую, на мой взгляд, можно было упорядочить. Программу, написанную Валерием Трофимовым, Виктором Будковским и Валентиной Шуб (кстати, студенткой 1-го курса), удачно воплотили в жизнь первокурсники под режиссёрским взглядом Елены Кузьменковой, Вероники Сидорчик, а также хореографии Тамары Коляды. Выступление экономистов очень понравилось зрителю, отмечено спонсорами конкурса: присуждением приза зрительских симпатий, достойно оценено жюри. Звания лауреатов были удостоены Наталья Шамкина, Валентина Шуб, Тамара Коляда и танцевальная группа первокурсников-экономистов. Лично мне хочется обнять всех их со словами: "Молодцы, братцы!"



Победители конкурса -- первокурсники биологического факультета.

Ну, а что же победитель? Каков он в этом году? А лидер был незамысловатым, но искренним, не нахальным, но по-своему, творчески дерзким. Выйдя на сцену первыми, первокурсники биологического факультета языком танцевальных жестов, игривых песен и присказок, легко и доступно для всех рассказали и показали сказку, которая предопределила победу в этом году. Конкуренция была большой, но старшекурсники Ольга Кравченко и Вячеслав Дорощенко рискнули не мудрить, а, раскрыв тему, основательно подготовиться. Тем самым быть на уровне. Вдвойне приятно мне, как художествен-

(Окончание на 4 стр.)

# ИГРА В СКАЗКУ. СЕРЬЁЗНАЯ И ТАЛАНТЛИВАЯ

(Окончание. Начало на 3 стр.)

ному руководителю, что после нескольких лет этот факультет не только оказался на победном гребне конкурса, но и впервые стал обладателем приза значительного традиционного конкурса "А ну-ка, первокурсник!". Музыкальное оформление Михаила Марченко, костюмы, постановка, тексты песен, сценарий -- всё отвечало положению конкурса этого года, а посему мне лишь остаётся ещё раз назвать имена лауреатов-первокурсников: Вероника Шитикова, Ирина Алексеева, Сергей Будов. Хочется поздравить тех, кто готовил ребят, а также декана факультета Алешко Степана Фёдоровича с победой его студентов и пожелать не упустить в будущем творческую пальму первенства.

А далее места распределились следующим образом: первокурсники геолого-географического факультета -- четвёртое место; будущие филологи были пятыми; затем студенты факультета физической культуры; первокурсники-физики, и завершили распределение мест будущие математики.

Хочу задержать своё внимание и на этих программах. Произвели хорошее впечатление, по моему личному мнению, и показали неплохие программы будущие математики и студенты геолого-географического факультета. Но им не хватило мастерства, воплощения идеи по-настоящему. Порой перескакивали с момента на момент или нелогично преподносили и оканчивали блоки в программе.

Хотя было видно, что ребята хотели проявить все свои способности, свой творческий потенциал.

Неплохие программы, волею случая с идентичными персонажами, показали студенты факультета физической культуры и физики. Но недоработали многого, а скорее всего не было у ребят "руки помощи" уже опытных и творчески матёрых старшекурсников. Своеобразной была программа филологов. Сочетая в себе интересные текстовки, умные фразы, логические домыслы, программа была статичной. Те отдельные номера солистов, качеству которых оценка была "хорошо" и "отлично", не смогли дотянуть программу до призовой тройки конкурса.

Останавливаясь на программах в целом, отмечу их постановки, неглупые тексты, качественное исполнение большинства номеров и, естественно, интерес, желание, энтузиазм, артистичность тех, кто воссоздавал сказки-программы этого года.

Жюри отметило немало студентов-первокурсников призами с присвоением звания лауреата конкурса. Помимо перечисленных выше это: Антонина Трофимец /математический ф-т/; Александр Жулего, Елена Светилова /филологический ф-т/ ; Максим Радуха, Алексей Самариков /геолого-географический ф-т/; Сергей Вартанян /ф-т физ.культуры/; Сергей Вяхирев /физический ф-т/.

*"Ах, в этот вечер*
*прекрасный зал*
*Всех дебютантов он*
*поддержал.*
*Погаснет рампа, уйдут*
*домой.*
*Но в 96-ом вернутся вновь".*

Этими тёплыми словами добродушных пародий закончился первокурсник 1995 года. Как художественный руководитель культурного центра университета я увидела и услышала то, что гарантирует творческий подъём в работе, приход талантливых юношей и девушек. А главное, обеспечит на протяжении последующих пяти лет у первокурсников интересную, незабываемую, неповторимую и такую необходимую каждому студенческую жизнь.

Я благодарю всех, кто принимал участие в подготовке этого мероприятия. Отдельное спасибо студенческой службе безопасности и моим коллегам, а также спонсорам конкурса: частному фонду поддержки и развития культуры (учредитель С.Ермак); фирмам "Белиса", "Совинфо", компании "Кока-Кола", профкому студентов. И с нетерпением жду и надеюсь на интересные программы, создаваемые студентами совместно с культурным центром, и конечно же, перед каждым мероприятием вопроса: "Нет ли лишнего билета в актовый зал ГГУ?"!

**М.ШИРИНКИНА,**
**художественный руководитель культурного центра.**
**Фото.Чистика.**



Радость студентов-экономистов при получении приза зрительских симпатий, учрежденного спонсором конкурса.



Фрагмент конкурсной программы историко-юридического факультета, в котором заняты Валерий Сережкин и Светлана Бобко.



# СТЫПЕНДЫІ ДААД ДЛЯ БЕЛАРУСІ

Нямецкай службай акадэмічных абменаў /ДААД/ для Рэспублікі Беларусь прапанаваны гадавыя і семестравыя стыпендыі на 1996/97 навучальны год.

Гадавыя стыпендыі прызначаны для маладых вучоных /да 32 г./ любых спецыяльнасцей, семестравыя -- для студэнтаў-германістаў.

Прыём дакументаў ад кандыдатаў на атрыманне стыпендый будзе праводзіцца ўпраўленнем замежных сувязей Мінадукацыі і навукі Беларусі /вул. Свярдлова, 7, п. 200, 206, тэл. 26-49-75, 26-44-84/ **да 10 снежня 1995 г.**

Кожнаму з кандыдатаў неабходна запоўніць анкету і іншыя даведкі і формы ў адпаведнасці з указаннямі на зваротным баку анкеты.

ДААД прапаноўвае беларускім вучоным, выпускнікам вышэйшых навучальных установаў і студэнтам наступныя стыпендыі:

**(Гадавыя стыпендыі /10 месяцаў: кастрычнік 1996 г. -- ліпень 1997 г./**
для асоб з закончанай вышэйшай адукацыяй па любых спецыяльнасцях для дадатковага навучання ў нямецкіх вышэйшых навучальных установах ва ўзросце не старэй 32 гадоў. Працягласць гэтых стыпендый у выключных выпадках можа быць падоўжана. Заявы павінны быць кваліфікавана абгрунтаванымі. Саіскальнікі па магчымасці павінны ўжо мець кантакт з нямецкімі вышэйшымі навучальнымі ўстановамі. Перавага аддаецца тым саіскальнікам, якія звязваюць сваю будучыню з навуковай кар"ерай у адной з беларускіх вышэйшых навучальных установаў.

Дакументы пры падачы заявы /на нямецкай мове/:

-- бланк заявы ДААД /запаўняецца ў машынапісу/;

-- аўтабіяграфія /у машынапісу/;

-- падрабязнае і дакладнае выкладанне мэт вучобы і даследчай дзейнасці;

-- рэкамендацыйныя лісты двух прафесараў /па профілю вучобы/ /у закрытым канверце/;

-- пры наяўнасці доказ наяўных кантактаў з выкладчыкам нямецкіх вышэйшых навучальных установаў, у якіх павінна праводзіцца вучоба;

-- пасведчанне аб валоданні нямецкай мовай, выдадзенае выкладчыкамі Нямецкага культурнага цэнтра імя Гётэ або прызнанымі выкладчыкамі нямецкай мовы. У вышэйшых навучальных установах, у якіх працуюць нямецкія выкладчыкі, пасведчанне павінна выдавацца нямецкімі выкладчыкамі;

-- даведка аб стане здароўя /бланк ДААД/; падаваць толькі пасля паспяховага папярэдняга адбору;

-- пасведчанні

а) атэстат аб сярэдняй адукацыі;

б) дыплом і, пры наяўнасці, пасведчанне аб прысуджэнні вучонай ступені.

Копіі пасведчанняў павінны быць афіцыйна заверaны на мове арыгінала і перакладзены на нямецкую мову.

Усе дакументы павінны падавацца ў трох экземплярах.

**(Гадавыя стыпендыі /10 месяцаў: кастрычнік 1996 г. -- ліпень 1997 г. для студэнтаў эканомікі 3-4 курсаў/.**

**Семестравыя (кароткатэрміновыя стыпендыі /5 месяцаў: кастрычнік 1996 -- ліпень 1997 г./**
для студэнтаў або асоб з вышэйшай адукацыяй /дактарантаў у галіне германістыкі/. Падаваць заявы на атрыманне стыпендый ДААД могуць студэнты 3 і 4 курсаў або асобы з закончанай вышэйшай адукацыяй /да 32 гадоў/ у галіне германістыкі і сумежных дысцыплін /напрыклад, нямецкая мова як замежная/. Асобы з закончанай вышэйшай адукацыяй павінны прадставіць абмежаваную ў часе мэту даследавання.

Падаюцца тыя ж дакументы, што і пры падачы заявы на гадавую стыпендыю.

**Стажыроўкі /1-3 месяцы/**
для вучоных усіх спецыяльнасцей, якія працуюць ва універсітэтах і іншых навучальных установах. Перадумовай выдзялення стыпендый з"яўляецца наяўнасць дакладна вызначанай вучэбнай або даследчай мэты, якая, па магчымасці, ужо ўзгоднена з нямецкім калегай, а таксама добрае веданне нямецкай або англійскай мовы.

*За ўсімі падрабязнымі даведкамі звяртацца ў аддзел міжнародных сувязей ГДУ /галоўны корпус, п.2-29, тэл. 56-31-75/.*

# ПАСЛЯ ПРАЦЯГЛАГА ПЕРАПЫНКУ

Пяць месяцаў калектыў санаторыя-прафілакторыя універсітэта з-за адсутнасці дзяржаўнага фінансавання знаходзіўся ў вымушаным адпачынку. Студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі ГДУ ўвесь гэты час былі пазбаўлены магчымасці папраўляць і ўмацоўваць сваё здароўе лячэбнымі працэдурамі, каларыйным трохразовым харчаваннем.

Нарэшце, пытанне выдзялення сродкаў на далейшае нармальнае функцыяніраванне універсітэцкай здраўніцы вырашылася станоўча. З 1-га лістапада санаторый-прафілакторый правёў першы ў бягучым навучальным годзе набор ў колькасці 70 чалавек для лячэння і аздараўлення. Цяпер кошт пуцёўкі для студэнтаў складае 52.400 руб., для выкладчыкаў і супрацоўнікаў -- 78.750 руб., курсоўка абыдзецца вам у 23.800 руб., а для студэнтаў -- у 15 тыс. руб. за адзін від лячэння /калі вы жадаеце атрымліваць іх пэўную колькасць, памножце на гэтыя сумы/.

У многіх членаў нашага калектыву, асабліва ў тых, хто не меў магчымасці ў час свайго водпуску атрымаць прафсаюзную курортную пуцёўку, застаюцца спадзяванні на тое, што збояў у прывычным рэжыме работы здраўніцы ГДУ ў далейшым больш не будзе.

**Т.НІКАЛАЕВА.**

СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ

## КАНДЫДАТ У НАЦЫЯНАЛЬНУЮ КАМАНДУ

У сталіцы нашай рэспублікі прайшлі асабістыя спаборніцтвы за Кубак Беларусі па фехтаванню, якія адкрылі новы цыкл спаборніцтваў на 1996 год, дзе будуць вызначацца кандыдаты ў нацыянальную каманду.

Трэцякурсніца факультэта фізічнай культуры майстар спорту Вольга Парфянкова стала бронзавым прызёрам у спаборніцтвах рапірыстак. Яна ўключана кандыдатам у нацыянальную каманду Беларусі.

Камітэт па спорту прысвоіў званне "Майстар спорту Рэспублікі Беларусь" студэнту 3 курса факультэта фізічнай культуры Аляксандру Собалю.

Нашых студэнтаў трэніруюць заслужаны трэнер Беларусі майстар спорту Венедыкт Лісоўскі і майстар спорту Віталь Хімакоў.

## НА СТАРЦЕ -- ПЕРШАКУРСНІКІ

Па ініцыятыве спартыўнага клуба ў студэнцкім скверы прайшоў асенні лёгкаатлетычны крос студэнтаў-першакурснікаў.

У бегу на 500 м перамагла студэнтка факультэта фізічнай культуры Алена Кандраценка, на другім месцы -- Алена Ліс /філалагічны факультэт/ і на трэцім -- Наталля Іваноўская /факультэт фізічнай культуры/.

У юнакоў прызавая тройка наступная: Андрэй Макаранка /факультэт фізічнай культуры/, Аляксандр Вайтовіч /эканамічны факультэт/ і Юрый Малахаў /факультэт фізічнай культуры/.

У камандным заліку месцы размеркаваліся так: эканамічны, фізічнай культуры, гісторыка-юрыдычны, матэматычны, філалагічны, фізічны, біялагічны і геолага-геаграфічны.

Пераможцам і прызёрам ў асабістых спаборніцтвах дырэктарам спартклуба дацэнтам Уладзімірам Лемяшковым уручаны тарты і грашовыя ўзнагароды. Грошы на гэта выдзелілі рэктарат і студэнцкі прафком.

**В.МАРЧАНКА.**

## СЯРОД ВНУ -- МАЦНЕЙШЫЯ

У Мінску прайшло каманднае першынство Беларусі па шматбор"ю "Здароўе" сярод вышэйшых навучальных устаноў.

Каманда нашага універсітэта, якую ўзначальвала трохразовая чэмпіёнка свету выкладчыца кафедры фізічнага выхавання майстар спорту Галіна Галаўнёва, упэўнена ўзнялася на вышэйшую прыступку п"едэстала гонару.

На другім месцы Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут і на трэцім -- Брэсцкі дзяржуніверсітэт.

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб"яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- алгебры і геаметрыі -- прафесара;

-- матэматычных праблем кіравання -- ст. выкладчыка;

-- тэорыі і методыкі фізічнай культуры -- ст.выкладчыка;

-- матаналізу -- асістэнта;

-- геафізікі -- ст. выкладчыка.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

## ГУЛЬНЯ Ў АДНЫ ВАРОТЫ

У дзяцінстве мы спазналі многія гульні. Не адмаўляемся ад іх і ў старэйшым узросце. Толькі непаседамі нас ужо ніхто не называе. Гуляем дома ў марскі бой, на вытворчасці -- у даміно з цыгарэтай у зубах. Дык вось цыгарэта хваліце пажарную службу ўсёй рэспублікі. Чытач можа ўсміхнуцца і не паверыць. Але менавіта нашай службе даводзіцца ўвесь час умешвацца ў гульню чалавека з агнём праз тую ж цыгарэту.

Па зразумелых прычынах мы не будзем называць прозвішчы пацярпеўшых, але скажам, што толькі ў кастрычніку ў Чыгуначным раёне г.Гомеля пажарныя выцягнулі з задымленых, палыхаючых кватэр трох мужчын /на пр-це Леніна, вул.8 Іншагародняй і Дакутовіч/. Курэнне ў ложку ў нецвярозым стане можна назваць гульнёй у адны вароты на карысць агню і спіртнога. У ліпені гэтага года пры аналагічнай сітуацыі грамадзянін І. з вул.Агаранка, 4 страціў правую руку. І надпіс на пачцы цыгарэт "Курэнне шкоднае для вашага здароўя" у жыцці выглядае больш трагічна, чым многія думаюць.

Яшчэ трагічныя выпадкі: з-за таго ж неасцярожнага абыходжання з агнём грамадзянін Ф. загінуў, грамадзянін Х. знаходзіцца пад следствам і будзе ў бліжэйшы час асуджаны. Курэнне на рабочым месцы ў нецвярозым стане таксама прыводзіць да сумных вынікаў: летам пажар успыхнуў па вул.Агаранка, 25. У тры гадзіны ночы пажарным давялося эвакуіраваць грамадзян са сваіх кватэр. Прыклады можна прыводзіць яшчэ і яшчэ, іх у нас дастаткова. А просьба да ўсіх адзіная -- не давярайцеся агню, не давярайце яму сваё жыллё, свае сем"і. Агонь -- сябар толькі пад жорсткім кантролем. Калі ён усё ж ўварвецца ў вашу кватэру, званіце нам па тэл. "01".

**Г.ЗУБАРАВА,**
**малодшы інспектар АВПЧ Чыгуначнага раёна г.Гомеля**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, Савет ветэранаў вайны і працы, калектыў геолага-геаграфічнага факультэта смуткуюць з выпадку смерці былога дацэнта кафедры агульнай геалогіі, пенсіянера **ЧЫЧЫНА** Міхаіла Іванавіча і выказваюць глыбокае спачуванне яго родным і блізкім.

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, дэканат філалагічнага факультэта, калектыў кафедры беларускай літаратуры выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту **СМЫКОЎСКАЙ** Валянціне Іванаўне з выпадку напаткаўшага яе гора -- смерці **МАЦІ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў кафедры псіхалогіі і давузаўскай падрыхтоўкі выказваюць глыбокае спачуванне дацэнту **МУРАЧКОЎСКАМУ** Мікалаю Іосіфавічу з выпадку смерці **МАЦІ** і асістэнту **ХАНЕНЮ** Сяргею Іванавічу з выпадку -- смерці **БАЦЬКІ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Рэгістрацыйны № 221
Спонсары газеты -- НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і зверстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, аддрукавана на Гомельскай фабрыцы "Палесдрук", г.Гомель, вул.Савецкая, 1.
За няякасны набор, вёрстку і памылкі фабрыка "Палесдрук" адказнасці не нясе.

Рэдактар
Ул.П. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.500 экз.
Заказ 634
Падпісана да друку 17.11.95.